***М.М. Дзядок***
***УА МДПУ імя І.П. Шамякіна (г. Мазыр)***

# ОНІМЫ-ЗАГАЛОЎКІ Ў ПАЭМАХ ЯКУБА КОЛАСА “СЫМОН-МУЗЫКА”, “МІХАСЁВЫ ПРЫГОДЫ”

Першым элементам любога тэксту з’яўляецца загаловак. Ён – першае слова-зварот да чытача. Гэта асаблівы “код”, у якім зашыфравана важная і істотная інфармацыя. Загаловачная канструкцыя – кампанент тэксту, “які выконвае функцыю сказа, але як назва твора ўспрымаецца ў якасці адзінкі лексічнага ўзроўню, якая суадносіцца з онімам” [1, 63]. Словы-онімы, якія выконваюць функцыю загалоўкаў, з’яўляюцца асобнай разнавіднасцю ўласных імёнаў. Яны вылучаюць твор з шэрагу іншых, выконваючы ў творы інфармацыйна-стылістычную ролю, якая значна павялічваецца на фоне ўсяго кантэксту, бо загаловак “працуе” і на тэму, і на ідэю, і на мастацкую задумку [2, 170–172].

Загаловак мае выключна важнае значэнне для раскрыцця ідэйнага і мастацкага асэнсавання тэксту. Онімы-загалоўкі ў мастацкіх тэкстах на матэрыяле твораў рускай класічнай літаратуры дастаткова падрабязна разглядалі А. Рогалеў [3, 36–47, 92–205], В. Фанякова [4, 61–75] і інш. Спецыфічна-моўныя асаблівасці загалоўкаў вывучала В. Фралова [5]. Ролю такіх адзінак у раскрыцці тэмы і ідэі твораў беларускай мастацкай літаратуры даследаваў В. Шур, разглядаючы асаблівасці такіх тэкставых кампанентаў у творах Якуба Коласа. У прыватнасці, апавяданняў “Дзеравеншчына”, “Балаховец”, “Туды, на Нёман!”, трылогіі “На ростанях”, аповесці “Дрыгва” і інш. [6, 128–137; 7, 159].

Увядзенне ўласнага імя ў якасці загалоўка – гэта свайго роду аўтарскі прыём і спецыфічны сродак выяўлення пазіцыі аўтара да дзейных асоб у творы, што выконваюць ключавыя, вызначальныя ролі. Пры гэтым



МГПУ им. И.П.Шамякина

канатацыйная функцыя такога загалоўка рэалізуецца не мікратэкстам, а ўсім зместам мастацкага твора [7, 15–16]. Такія адзінкі, па словах даследчыкаў, маюць функцыянальную нагрузку ў адносінах да ўсяго тэкставага комплексу. Яны заўсёды ў цэнтры ўвагі чытача, і відавочна, што гэта "галоўная адзінка анамастычнай прасторы мастацкага твора", якая ў агульнай канве з'яўляецца эстэтычным кампанентам раскрыцця ідэі твора, стварэння вобразаў. Б. Плотнікаў таксама лічыць, што найбольш сціслай анатацыяй ці рэзюмэ, бадай, любога мастацкага твора (а таксама навуковага, і публіцыстычнага) служыць яго загаловак, "які звычайна патэнцыяльна зараджаны ідэяй гэтага твора, змяшчае яе, як, напрыклад, жолуд усе ўласцівасці дуба" [8, 35]. Даследчык справядліва адзначыў, што "ў тэксце сэнс загаловачнага слова разгортваецца семантыкай цэлага вееру сэнсава, дэрывацыйна і тэматычна роднасных лексем" [8, 35].

У працах вядомых даследчыкаў анамастычнай лексікі адзначаецца, што тыповы загаловак звязаны з усімі ўзроўнямі тэксту, з усімі яго часткамі і галоўнай ідэяй адносінамі ўзаемазалежнасці. "З аднаго боку ён вызначае змест твора, з другога – сам абумоўлены ім, развіваецца, узбагачаецца па меры таго, як разгортваецца тэкст. Таму відавочна, што загаловак да прачытання твора і пасля яго ў змястоўным плане далёка не адно і тое ж" [9, 36].

Структурна-семантычныя асаблівасці загаловачнага комплексу вызначаюцца асобай аўтара, жанрам і часам яго стварэння. Гэта ў пэўным сэнсе кампрэсаваны сродак, у якім выражаецца неабсяжны сэнс праз абмежаваныя па аб'ёме графічныя сродкі. Згодна з характарам семантыкі загаловачных намінацый, з напоўненасцю і скіраванасцю іх унутранай формы А. Рогалеў выдзеліў наступныя тыпы загалоўкаў: прадметна-апісальныя; вобразна-тэматычныя; ідэйна-характарыстычныя; ідэйна-тэматычныя, або полівалентныя [9, 40].

Прэзентуючы мастацкі твор, загаловак настройвае чытача на ўспрыманне тэксту. Так, прагназуючая функцыя загалоўка рэалізуецца ў назвах паэм Якуба Коласа "Сымон-музыка" і "Міхасёвы прыгоды", якія раскрываюць тэму і асноўны змест паэм, паведамляецца імя галоўнага персанажа, якое захоўвае ў сваёй унутранай форме абагулены змест. Па меркаванні даследчыкаў, функцыя загалоўка мастацкага твора памацняецца, калі ён выражаны праз другі паэтонім, які ўваходзіць у канкрэтнае анамастычнае поле антрапонімаў.

У паэме "Сымон-музыка" загаловак мае абагульнена-сімвалічны характар, што дазваляе ўспрыняць яго больш глыбока, звярнуць асаблівую ўвагу на галоўнага героя твора з такім складаным лёсам і звязаць з архетыпным мастацкім сімвалам. Так, Я. Колас у лірычным прысвячэнні, якое адкрывае паэму, падкрэсліваў, што яна прысвечана беларускай моладзі. Гэта своеасаблівы "ключ" да цэласнага ўспрымання твора. Пісьменнік ужывае ў якасці загалоўка азначэнне-прыдатак ў спалучэнні з уласным іменем (*Сымон-музыка*). Эпітэт-прыдатак займае

МГПУ им. И.П. Шамякина

постпазіцыйнае становішча і характарызуе носьбіта імя паводле роду занятку – “гэта падказка ў характарыстыцы мастацкага вобраза” [9, 52]. Менавіта прыдаткам (*музыка*), адзначае Б. Плотнікаў, выдзяляецца найважнейшая семантычная рыса імені Сымон, а праз яе і прыродны талент галоўнага персанажа, носьбіта гэтага імені [8, 35]. Імя ў загалоўку, яго прафесійная і грамадская сутнасць “гаворыць”, што усё самае дарагое, што аўтар хацеў сказаць сваім творам, заключана найперш у вобразе не проста *Сымона*, а *Сымона-музыкі* [10, 239]. Такія загалоўкі шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры, даючы магчымасць больш поўна акрэсліць апісанне вобраза, дапамагаюць стварыць аб’ёмны вобраз героя, раскрыць яго ўнутраную сутнасць, “падкрэсліць яго самыя тонкія, амаль няўлоўныя прыметы, якасці, уласцівасці, забяспечыць багаты падтэкст” [11, 154]. Азначэнне-прыдатак акрэслівае сутнасць персанажа, на якога трэба глядзець з той пазіцыі, што ён музыка, творца, мастак – тут спосаб выяўлення аўтарскай пазіцыі. Эпітэт-прыдатак у спалучэнні з онімам успрымаецца як функцыянальны і стылёва мнагапланавы кампанент. Такія загалоўкі, як лічаць даследчыкі, з’яўляюцца паказчыкамі высокай моўнай культуры аўтара, развітай сістэмы яго мыслення. У дадзеным выпадку прыдатак узбагачае мову твора, надае адметнасць стылю пісьменніка.

У творчай спадчыне Я. Коласа засведчана больш за 20 загалоўкаў з эпітэтамі-прыдаткамі. Такія атрыбутыўныя спалучэнні з’яўляюцца семантычна і экспрэсіўна маркіраванымі адзінкамі ў творах пісьменніка: “*Андрэй-выбаршчык*”, “*Пятрусь-касец*”, “*Рак-вусач*”, “*Дзед-госць*”, “*Савось-распуснік*”, “*Баяну-кабзару*” і інш., у тым ліку і ў паэме “*Сымон-музыка*”. Музыка – нейтральны эпітэт-прыдатак, які ў такім спалучэнні садзейнічае замацаванню меліяратыўнай канатацыі, лаканічнай станоўчай характарыстыкі персанажа, імя якога ўзята ў якасці галоўнага ў творы. “У спалучэнні з онімам такі прыдатак шырока выкарыстоўваецца як сродак стварэння меліяратыўнай семантыкі, з’яўляючыся актуалізатарам і інтэнсіфікатарам набытага канатацыйнага патэнцыялу оніма” [6, 47].

Загаловак “Міхасёвы прыгоды” мае прамы сэнсавы план і называе галоўнага лірычнага героя паэмы. Здаецца, усё зразумела і празрыста: аўтар расказвае аб прыгодах хлопчыка *Міхаські* на вёсцы, куды ён паехаў улетку на адпачынак пасля цяжкай хваробы. Міхаська не толькі даведаўся шмат новага і цікавага, але і сам расказвае вясковым дзецям, як праходзяць на Чырвонай плошчы парады, пра машыны і трамваі, пра жыццё ў дзіцячым садку. Для сучаснага чытача гэтыя радкі гучаць крыху наіўна і не нова, але для 30-х гг. XX ст. такія звесткі былі новымі і цікавымі. Такім чынам, пад такой немудрагелістай назвай пісьменнік паказаў не толькі прыгоды хлопчыка Міхася, а праз прызму дзіцячага бачання “адлюстраваў асаблівасці жыцця дзяцей савецкай краіны даваеннага часу” [12, 151].

МГПУ им. И.П. Шамякина

Такім чынам, онімы-загалоўкі паэм Якуба Коласа “Сымон-музыка” і “Міхасёвы прыгоды” выконваюць ключавую ролю ў тэксце, валодаюць канатацыйным патэнцыялам. Семантыка-стылістычная сутнасць загалоўкаў паэм вызначальная, бо канатацыйны бок раскрываецца зместам усяго твора. Яны ўяўляюць сабой арганізуючае звяно сюжэтных ліній твораў і канцэнтраванае выражэнне аўтарскай ідэі, дапамагаючы пісьменніку і чытачу ў фарміраванні агульнага ўяўлення пра твор, яго ідэйны змест.

Такім чынам, загалоўкі твораў Я. Коласа настройваюць чытача на адпаведную хвалю, вучаць яго аператыўна знаходзіць неабходную інфармацыю, закладзеную ў тэксце, імпліцытна бачыць асноўныя сюжэтныя лініі твора, адчуваць прыхаваны аўтарам падтэкст.

### Литература

1. Матвеев, Б. И. Первое слово автора, обращенное к читателю / Б. И. Матвеев // Русский язык в школе. – 1996. – № 2. – С. 63–71.

2. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2009. – 254 с.

3. Фонякова, О. И. Имя собственное в художественном тексте. Учебное пособие / О.И. Фонякова. – Ленинград: ЛГУ, 1990. – 104 с.

4. Фролова, О. Е. Грамматика заглавия [Текст] / О. Е. Фролова // Русская речь. – 2006. – № 5. – С. 49–57.

5. Шур, В. В. Онім у мастацкім тэксце: манаграфія / В. В. Шур. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2006. – 216 с.

6. Плотнікаў, Б. Музычная лексіка ў паэме “Сымон-музыка” Якуба Коласа / Б. Плотнікаў // Роднае слова. – 2005. – № 8. – С. 35–36.

7. Рогалев, А. Имя и образ: художественная функцыя имён собственных в литературных произведениях и сказках / А. Ф. Рогалев. – Гомель: Барк, 2007. – 224 с.

8. Рогалев, А. Имя и образ: художественная функцыя имён собственных в литературных произведениях и сказках / А. Ф. Рогалев. – Гомель: Барк, 2007. – 224 с.

9. Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе: дапам. для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. – Мінск: Аверсэв, 2006. – 320 с.

10. Шур, В. В. Анамастычная лексіка ў творах Якуба Коласа / В. В. Шур // Беларуская мова і літаратура. – 2000. – № 4. – С. 105–121.

11. Шур, В. В. Онім у мастацкім тэксце: манаграфія / В. В. Шур. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2006. – 216 с.

12. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / А.М. Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 688 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина